Установа вышэйшай адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
________________ А. А. Корбут
«____»______________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ

## Раздзел 3. АСНОВЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені ОСВО 1-23 01 11-2014 па спецыяльнасці Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-45/14 вуч., Е 23-1-47/14 вуч., Е 23-1-46/14 вуч.


**СКЛАДАЛЬНІК**

*В. Е. Лявончыкаў,* прафесар кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, прафесар


**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Р. С. Матульскі,* дырэктар дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», доктар педагагічных навук, прафесар;
*В. В. Нешытой,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар тэхнічных навук, прафесар

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРЖЭННЯ:**

кафедрай тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 25.11.2016);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 08.12.2016)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: В. Е. Лявончыкаў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Адзінства вучэбнай і навуковай работы ў вышэйшых навучальных установах азначае, што ў працэсе падрыхтоўкі кадраў выкладчыкам неабходна навучыць студэнтаў не толькі добра здзяйсняць практычныя працэсы, формы і метады сваёй будучай работы, але асэнсоўваць яе станоўчыя бакі і недахопы, праводзіць навуковыя даследаванні і ўкараняць іх вынікі (веды) у практыку, гэта значыць творча падыходзіць да сваёй справы.

Актуальнасць вучэбнай дысцыпліны «Асновы навукова-даследчай работы» абумоўлена значным пашырэннем навуковых даследаванняў у галіне бібліятэчнай справы, якая носіць дынамічны характар. Дынамізм у дзейнасці бібліятэк дэтэрмінуецца двума галоўнымі знешнімі фактарамі. З аднаго боку, у геаметрычнай прагрэсіі павялічваюцца веды (а значыць і дакументная інфармацыя), а з другога – назіраецца тэндэнцыя хуткага старэння інфармацыі. Вынікам дзеяння гэтых фактараў з'яўляецца павелічэнне і змяненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэк. Таму бібліятэкам неабходна ўвесь час удасканальваць, змяняць формы і метады сваёй дзейнасці ці, па-іншаму, укараняць розныя інавацыі. На сучасным этапе ў бібліятэказнаўстве нават сфарміраваўся новы напрамак даследаванняў – бібліятэчная інаватыка, які прадугледжвае навуковую распрацоўку тэарэтычных, метадычных, тэхналагічных і арганізацыйных праблем па ўкараненні інавацый у дзейнасць бібліятэк.

У сучаснай метадалогіі навуковых даследаванняў выдзяляюцца два віды ведаў: прадметныя, звязаныя з прафесійнай практычнай работай будучых спецыялістаў, і рэгулятыўна-нарматыўныя (метадалагічныя), накіраваныя на навуковае пазнанне прадметна-практычнай дзейнасці. Вучэбная дысцыпліна «Асновы навукова-даследчай работы» накіравана на раскрыццё спецыфікі навуковага пазнання, форм яго тэарэтычнага асэнсавання ў сферы дакументных камунікацый, менавіта ў бібліятэчнай справе як іх кампанента і базіруецца на ведах, якія атрымалі студэнты пры вывучэнні філасофіі і логікі і іншых спецыяльных дысцыплін.

Вучэбная дысцыпліна «Асновы навукова-даследчай работы» цесна звязана з дысцыплінамі агульнанавуковага і агульнапра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фесійнага цыклаў: «Бібліятэказнаўста. Тэорыя», «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя», «Бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Асновы навукова-даследчай работы» – засвоіць веды і ўменні выканання студэнтамі (усіх напрамкаў па спецыяльнасці «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць») навуковых і навукова-вучэбных работ (рэфератаў, кантрольных, курсавых, дыпломных, навукова-даследчых работ) і афармленні іх вынікаў у адпаведнасці з агульнапрынятымі метадалагічнымі нормамі. У дадзенай вучэбнай дысцыпліне адлюстроўваюцца пераважна агульнаметадалагічныя і агульнаметадычныя аспекты даследчай работы, змест якіх у працэсе бесперапыннай метадалагічнай падрыхтоўкі студэнтаў павінен быць напоўнены і адаптаваны да спецыфікі канкрэтнай спецыяльнай дысцыпліны і напрамку спецыяльнасці.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый адпаведна з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках):

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп’ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць вырашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-4. Весці інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў розных сфер дзейнасці.

ПК-7. Фарміраваць інфармацыйную культуру карыстальнікаў.

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю.

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі.

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках розных тыпаў і відаў.

ПК-37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– асноўныя паняцці навукі і навуковых даследаванняў;

– спецыфіку навукі як галіны дзейнасці, яе мэты, функцыі, вынікі, віды навуковых даследаванняў;

– законы, прынцыпы пазнання, агульналагічныя, агульнанавуковыя і прыватнаметадычныя даследаванні;

– асноўныя прыёмы выбару актуальнай тэмы для даследавання, спосабы складання праграмы (плана-праспекта) яго правядзення;

– метады збору інфармацыі і метады работы з тэкстамі;

– агульную методыку правядзення сацыялагічных даследаванняў у бібліятэцы (анкетнага апытання ці інтэрв'ю);

*умець*:

– складаць праграму навуковага даследавання;

– весці аналіз і сінтэз навуковай літаратуры па тэме даследавання;

– афармляць цытаты і іншыя выпіскі з тэкстаў навуковай літаратуры;

– ссылацца на факты і афармляць бібліяграфічныя спасылкі на крыніцы інфармацыі;

– фармуляваць падзейныя, матывацыйныя і статусныя пытанні пры правядзенні анкетнага апытання ці інтэрв'ю;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– тэрмінамі і паняццямі, якія склаліся ў асновах навуковых даследаванняў;

– методыкай бібліяграфічнага пошуку крыніц інфармацыі па тэме даследавання;

– логікай доказу і абвяржэння пры напісанні навуковай работы;

– правіламі афармлення тытульнага ліста па навуковых і вучэбна-навуковых работах, бібліяграфічных спасылак і зносак;

– правіламі складання і адбору пытанняў апытальнага збору сацыяльнай інфармацыі (анкеты, інтэрв'ю);

– патрабаваннямі і структурнымі элементамі пры напісанні курсавых і дыпломных работ;

– відамі пытанняў у анкетах па змесце, форме, функцыях і сэнсе фармуліроўкі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Асновы навукова-даследчай работы» ўсяго адведзена 70 гадзін, з іх 40 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 16 гадзін, лабараторныя заняткі – 8 гадзін, практычныя заняткі – 14 гадзін, семінарскія заняткі – 2 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Уводзіны*

Мэта, задачы вучэбнай дысцыпліны «Асновы навукова-даследчай работы». Яе значэнне і месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі. Сувязь з іншымі дысцыплінамі агульнанавуковага і агульнапрафесійнага цыклаў. Забяспечанасць тэарэтычнай, вучэбнай і метадычнай літаратурай. Структура вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка асноўных раздзелаў, вывучаемых у яе межах. Асноўныя формы аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў. Выніковыя і прамежкавыя формы кантролю.

*Тэма 1. Агульнае ўяўленне аб навуцы*

Навука як самая важная форма пазнання ў сучасным свеце. Паняцце навукі. Навука як дзейнасць, сацыяльны інстытут і сістэма ведаў. Мэты, функцыі і вынікі навукі. Паняцці «веды» і «навуковыя веды», іх узаемасувязь і спецыфіка.

Пазнавальныя дзеянні чалавека (як пазанавуковыя, так і навуковыя). Формы пазнання (пачуццёвыя і рацыянальныя). Навука як сістэма ведаў аб прыродзе, грамадстве, чалавеку, тэхніцы. Яна ўключае ў сябе наступныя ўзроўні: эмпірычныя веды (практыка – гэта метады, тэхналогіі, арганізацыя і кіраванне пэўнай дзейнасцю); тэарэтычныя веды – навуковыя тэорыі пазнання (канцэпцыі) ці парадыгмы; метадалагічныя (прынцыпы і метады пазнання і даследавання); гістарычныя веды (эвалюцыя і развіццё пэўнай галіны дзейнасці).

Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства ў сістэме сацыяльных і гуманітарных навук.

*Тэма 2. Метадалогія навуковага пазнання*

Паняцце «метад» і «метадалогія». Шматузроўневая канцэпцыя метадалагічных ведаў. Філасофска-метадалагічны аналіз навукі. Агульнанавуковая метадалогія пазнання. Прыватнанавуковая метадалогія, менавіта: кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства.

Філасофскія законы развіцця і пазнання, прынцыпы і катэгорыі дыялектыкі і іх трактоўка адносна пазнання бібліятэчнай справы, бібліяграфіі, кнігавыдавецкай дзейнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульнанавуковыя метады і іх выкарыстанне ў кнігазнаўстве, бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве. Гістарычны метад. Інфармацыйны, сістэмны, дзейсны, сінергетычны, герменеўтычны метады і іх асэнсаванне пры даследаванні дзейнасці бібліятэк, бібліяграфіі, кніжнай справы.

Спецыяльныя метады кнігазнаўства, бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства.

### *Тэма 3. Прымяненне лагічных законаў і правілаў*

Патрабаванні лагічных законаў тоеснасці, супярэчнасці, закона выключэння трэцяга, закона дастатковага аснавання (доказу) – у навуковым даследаванні. Лагічныя правілы класіфікацыі аб’ектаў даследавання.

Доказ і абвяржэнне і іх структурныя элементы. Азначэнне паняццяў «тэзіс», «аргументы», «дэманстрацыя». Лагічныя патрабаванні да вылучэння тэзісаў, пабудовы аргументацыі і дэманстрацыі. Лагічныя і прадметныя памылкі ў навуковых даследаваннях пры ўжыванні элементаў доказу і абвяржэння.

### *Тэма 4. Навуковае даследаванне ў метадалагічным асэнсаванні*

Паняцце «навуковае даследаванне». Працэсуальныя элементы навуковага даследавання: выбар тэмы (актуальнасць, сацыяльны заказ, супярэчлівая сітуацыя), фармуліроўка праблемы (тэмы) і выбар рэпрэзентатыўнага аб’екта і метадаў даследавання, назапашванне новай інфармацыі і канцэптуалізацыя ведаў, выкладанне і аргументацыя (доказ) высноў.

Прадметныя элементы навуковага даследавання. Аб’ект і прадмет даследавання. Тэма і пытанні ў структуры навуковага даследавання. Мэты і задачы даследавання, умовы даследавання, сродкі і метады навуковага даследавання. Агульналагічныя метады пазнання (параўнанне, аналіз, сінтэз, абстрагаванне, абагульненне, індукцыя, дэдукцыя, аналогія, мадэляванне), агульнанавуковыя метады даследавання (эмпірычныя – назіранне, апісанне, эксперымент, вымярэнне), тэарэтычныя (мысленны эксперымент, ідэалізацыя, фармалізацыя і інш.), узроўні навуковага даследавання, вынікі даследавання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 5. Метадычнае забеспячэнне навуковага даследавання*

Паняцце «методыка». Паслядоўнасць пошуку крыніц па тэме даследавання. Вывучэнне і сістэматызацыя адабраных матэрыялаў. Паняцці: план, тэзісы, канспект, цытата і іншыя выпіскі з тэксту крыніцы. Распрацоўка плана. Напісанне тэксту работы і яго рэдагаванне. Афармленне навукова-даследчай работы. Афармленне тытульнага ліста, бібліяграфічных спасылак, зносак. Афармленне бібліяграфічнага спіса выкарыстанай літаратуры і крыніц. Дадаткі да навуковай работы.

*Тэма 6. Агульная методыка правядзення сацыялагічных даследаванняў у бібліятэках*

Апытальныя методыкі збору сацыяльнай інфармацыі. Анкетаванне – пісьмовае апытанне, якое разлічана на атрыманне адказаў рэспандэнтаў на ўпарадкаваны па змесце і форме спіс пытанняў і выказванняў. Інтэрв’юіраванне – вуснае апытанне, пры якім адбываецца кантакт інтэрв’юера з рэспандэнтам, а запіс адказаў праводзіцца з дапамогай механічных сродкаў (дыктафона). Бяседа – від апытання, які грунтуецца на супрацоўніцтве яго ўдзельнікаў, якія згадзіліся прыняць удзел у даследаванні. Пытанне як аснова інструментарыя даследавання з выкарыстаннем апытальных метадаў. Віды пытанняў па змесце, форме, функцыях, па сэнсе фармуліроўкі пытання. Працэдура вымярэння з дапамогай розных тыпаў шкал: намінальныя, рангавыя (парадкавыя) і інтэрвальныя. Уяўленне аб выбарачнай сукупнасці і рэпрэзентатыўнасці. Квотная выбарка. Патрабаванні да складання і адбору пытанняў да апытальнага ліста. Прыкладная мадэль анкеты. Аналіз дакументаў як метад збору сацыялагічнай інфармацыі.

*Тэма 7. Метадалагічнае асэнсаванне і метадычнае забеспячэнне вучэбна-даследчых работ*

Асноўныя віды навукова-вучэбных работ. Вучэбны рэферат, яго мэта, асноўныя функцыі. Асноўныя этапы работы над рэфератам. Сістэматызацыя і рэпрадуктыўная пабудова рэферата. Асноўныя крытэрыі ацэнкі рэферата.

Кантрольная работа як разнавіднасць рэферата. Змястоўная спецыфіка кантрольнай работы, якая павінна забяспечыць вывучэнне і замацаванне ведаў па вучэбнай дысцыпліне цалкам ці

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

яе частцы. Наяўнасць, акрамя рэпрадуктыўнай, прадуктыўнай (творчай) пераапрацоўкі ведаў. Сістэматызацыя і абагульненне ведаў.

Асноўныя віды вучэбна-даследчых работ. Курсавая работа як адзін з важных відаў вучэбнага працэсу. Выбар тэмы і складанне плана курсавой работы. Устанаўленне аб’екта даследавання, мэт і задач, кола пытанняў, якія будуць разгледжаны ў курсавой рабоце. Тэхналогія падрыхтоўкі курсавой работы і метады даследавання. Лагічныя правілы дзялення структурных частак курсавой работы на главы і параграфы. Мова і стыль курсавой работы.

Дыпломная работа, яе мэты, задачы. Агульныя патрабаванні да дыпломнай работы. Структурныя элементы дыпломнай работы. Змест уводзін, асноўнай часткі, заключэння і дадаткаў да дыпломнай работы. Патрабаванні да тэарэтычнага, аналітычнага і праектнага раздзелаў дыпломнай работы. Суадносіны рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай (творчай) пераапрацоўкі ведаў. Абагульненне канкрэтнай практыкі бібліятэчна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
# ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | семінарскія заняткі | лабараторныя заняткі | | |
| | Уводзіны | 1 | | | | | |
| 1 | Агульнае ўяўленне аб навуцы | 1 | 2 | | | | апытанне на семінары |
| 2 | Метадалогія навуковага пазнання | 1 | 4 | 2 | | | апытанне на семінары |
| 3 | Прымяненне лагічных законаў і правілаў | 2 | | | | | тэсты |
| 4 | Навуковае даследаванне ў метадалагічным асэнсаванні | 1 | 2 | | 4 | 2 | апытанне на семінары |
| 5 | Метадычнае забеспячэнне навуковага даследавання | 2 | 2 | | | 2 | тэсты |
| 6 | Агульная методыка правядзення сацыялагічных даследаванняў у бібліятэках | 2 | 2 | | 2 | 2 | апытанне на семінары |
| 7 | Метадалагічнае асэнсаванне і метадычнае забеспячэнне вучэбна-даследчых работ | 2 | | | | 2 | апытанне на семінары |
| | **Разам…** | **12** | **12** | **2** | **6** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

### *Асноўная*

1. *Крейденко, В. С.* Библиотечные исследования : учеб.-метод. пособие / В. С. Крейденко. – М. : Русская школьная библиотечная ассоциация, 2007. – С. 56–75, 76–108, 109–143.

2. *Кузнецов, И. Н.* Рефераты, курсовые и дипломные работы. Методика подготовки и оформления : учеб.-метод. пособие / И. Н. Кузнецов. – 3-е изд., перераб. и доп. – М., 2006. – С. 5–39.

3. *Кузнецов, И. Н.* Основы научных исследований : учеб. пособие для бакалавров / И. Н. Кузнецов. – 2-е изд. – М. : Дашков и К, 2016. – 284 с.

4. *Лукашевич, В. К.* Методология научного исследования : учеб. пособие для студентов / В. К. Лукашевич. – Минск, 2002. – 120 с.

5. Научные работы: Методы подготовки и оформления / сост. И. Н. Кузнецов. – Минск : Амалфея, 1998. – С. 16–31.

6. *Панковская, П. Я.* Методология научных исследований : курс лекций / П. Я. Панковская. – Минск: Информпресс, 2002. – С. 7–30.

7. *Рузавин, Г. И.* Методология научного исследования : учеб. пособие для студентов вузов / Г. И. Рузавин. – М. : Юнити-Дана, 1999. – С. 262–271, 274–281.

8. Социологические исследования в библиотеках : практ. пособие / И. Г. Васильев, М. Е. Илле, Д. К. Равинский. – СПб. : Профессия, 2003. – 176 с.

9. Сацыялагічныя даследаванні ў бібліятэках : метад. рэк. / склад. : М. І. Андарала, Т. І. Папова, Т. У. Котава. – Мінск : Нац. б-ка Беларусі, 1999. – 44 с.

### *Дадатковая*

1. *Баренбаум, И. Е.* Общенаучные и специальные методы книговедения, библиотековедения, библиографоведения и информатики / И. Е. Баренбаум, В. С. Крейденко, В. П. Леонов //

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Связь библиотечно-библиографических дисциплин с информатикой : сб. науч. тр. / ЛГИК. – Ленинград, 1982. – С. 47–57.

*2. Зубра, А. С.* Культура умственного труда : учеб. пособие / А. С. Зубра ; Респ. ин-т проф. образования. – Минск : РИПО, 1997. – 112 с.

*3.* Методические указания по подготовке курсовых и дипломных работ для специальности 1-23 01 11 Библиотечно-информационная деятельность (по направлениям) / сост. : Р. А. Ровина, Н. А. Яцевич. – Минск : БГУКИ, 2016. – 29 с.

*4. Розанова, Н. М.* Научно-исследовательская работа студента : учеб.-практ. пособие / Н. М. Розанова. – М. : КНОРУС, 2016. – 256 с. – (Бакалавриат).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў выкладання

Лекцыйныя заняткі амаль усе праводзяцца метадам праблемнага навучання, але асобныя пытанні практычнага характару чытаюцца з ужываннем метаду рэпрадуктыўнага. Лекцыя, прысвечаная сацыялагічным даследаванням у бібліятэках чытаецца з прэзентацыяй. Навуковыя падыходы выкладаюцца з ужываннем тлумачальна-ілюстратыўнага метаду.

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

– стандартныя заданні па асноўных раздзелах дысцыпліны;
– праблемныя заданні па асноўных тэмах дысцыпліны;
– апытанне на семінарах;
– праверка якасці выканання самастойных работ і правядзенне іх абмеркавання;
– выкананне даследчых заданняў (распрацоўка праекта ліцэнзійнай дамовы аб перадачы правоў на адзін з аб’ектаў аўтарскага права);
– падрыхтоўка рэфератаў па навукова-даследчай рабоце;
– тэставая праверка ведаў студэнтаў па тэмах дысцыпліны.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

У мэтах павышэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне і фарміравання прафесійных кампетэнцый вучэбным планам спецыяльнасці прадугледжана самастойная работа студэнтаў, якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў; фарміраванне ў іх уменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў; фарміраванне ўменняў і навыкаў самастойнага прымянення ведаў на практыцы; на самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае работу з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытанняў дысцыпліны, падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў і заліку. Выкананая праца павінна адлюстроўваць ступень засваення студэнтам асноўных тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна думаць, абагульняць матэрыял, вызначаць дасягненні, праблемы, рабіць высновы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ

## Раздзел 3. АСНОВЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,51. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.